**Список цитируемых источников**

1. *Кондрашова, Л. В.* Имитационно-игровое обучение в высшей школе / Л. В. Кондрашова, Т. Г. Виевская, Л. А. Савиченко. — Кривой Рог : [б. и.], 2001. — 112 с.
2. *Эльконин, Д. В.* Психология игры / Д. В. Эльконин. — М. : [б. и.], 1978. — 427 с.
3. *Ананьев, Б. Г.* Человек как предмет познания / Б. Г. Ананьев. — Л. : [б. и.], 1968. — 375 с.

Материал поступил в редакцию 25.10.2013 г.

**УДК 37.035.6**

***Г. І. Ваўчок, С. М. Сарачынская***
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы

# ФАРМІРАВАННЕ ЭТНАКУЛЬТУРНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ СРОДКАМІ КРЫТЫЧНАГА МЫСЛЕННЯ

Развіццё асобы заўсёды адбываецца ў сацыякультурным асяроддзі народа, які мае сваю гісторыю, культуру, свой менталітэт. Для таго каб стаць прадстаўніком пэўнай чалавечай супольнасці, далучыцца да духоўнай культуры свайго народа, стаць прадаўжальнікам і носьбітам нацыянальнай культуры, неабходна ведаць побытавыя, маральна-этычныя і моўна-маўленчыя традыцыі свайго народа, інакш — этнакультурную кампетэнцыю.

Этнакультурная кампетэнцыя фарміруецца ў працэсе развіцця асобы на ўсіх этапах, ва ўсіх сферах і відах жыццядзейнасці. Гэта вынік markерознабаковых узаемаадносін асобы з людзьмі і грамадствам, адносін, якія выступаюць як працэс засваення ідэальна-змястоўнай сутнасці этнакультуры, адэкватных ёй сацыяльных дзеянняў і ўзаемадзеянняў, як адна з форм сутнаснага інтэлектуальнага, эмацыянальнага і маральна-этычнага развіцця асобы [1, с. 55].

Фарміраванне этнакультурнай кампетэнцыі будучых настаўнікаў патрабуе адпаведных метадычных падыходаў. Такім універсальным сродкам выступае тэхналогія крытычнага мыслення, якая, у адрозненне ад традыцыйных падыходаў у навучанні, будуецца (не) на перадачы ведаў, а прадугледжвае магчымасць здабываць іх ва ўласнай дзейнасці.

Заняткі па беларускай мове маюць вялікія магчымасцямі ў фарміраванні адэкватных адносін да нацыянальнай спадчыны, набыткаў іншых народаў, у пашырэнні ведаў студэнтаў пра этнакультурныя асновы свайго народа, яго спрадвечныя каштоўнасці, як духоўныя, так і матэрыяльныя. Такія прыёмы, як «Мазгавая атака», «Апавяданне — прагноз па ключавых словах», «Кластар», «Дыяграма Вена», «Дзённік падвоенага запісу», «К'юбінг» і іншыя дазваляюць абагульніць веды, выклікаць устойлівую цікавасць да вывучаемага матэрыялу, актывізаваць студэнтаў.

Напрыклад, пры знаёмстве з тэмай «Перыфразы. Устойлівыя параўнанні» можна прапанаваць студэнтам падабраць перыфразы да слова *лён*. Найбольш удалымі будуць словазлучэнні *беларускі шоўк, паўночны шоўк*. З мэтай пашырэння звестак пра выкарыстанне льняных вырабаў у іншых народаў падаецца наступная інфармацыя: льняное адзенне «гладкае, не маркае, не цяжкае, прыдатнае ў кожную пару года» (Плутарх). Палатняныя латы насілі воіны цара Ксеркса, бо яны «не грэлі», як металічныя, аднак іх не прабівала страла. У Старажытным Рыме льняныя абрусы, што нашы продкі засцілалі штодня на стол, былі прыкметай раскошы. Льняное адзенне насілі фараоны і жрацы.

Актуалізацыя такіх звестак спрыяе фарміраванню каштоўнасных адносін студэнтаў да канкрэтных элементаў этнакультуры.

У канцы гутаркі можна прапанаваць складанне сінквейна з ключавым словам «лён». Эфектыўнасць дадзенага прыёму ў наступным: сінквейн як прыём служыць для сінтэзу і абагульнення інфармацыі, развівае слоўнікавы запас, з'яўляецца сродкам творчага самавыяўлення.

Прыклад сінквейна па тэме «Лён»:

*Лён*
*Сінявокі, залацісты*
*Саграваe, упрыгожвае, лечыць*
*Гэтым славіцца родная Беларусь*
*Шоўк*

Улічваючы актуальнасць дзейнаснага падыходу ў навучанні, мэтазгодна арганізоўваць самастойную пошукавую работу студэнтаў, што спрыяе іх станаўленню як актыўных грамадзян сваёй дзяржавы. Адзін з яе відаў — аналіз зместу прыказак, у якіх ужываецца слова 'хлеб', каб вызначыць, які 'хлеб' ядуць беларусы. Аналіз паказаў, што слова 'хлеб' ужываецца ў трох значэннях: 1. Прадукт харчавання, які выпякаецца з мукі. 2. Зерне, якое мелецца на муку. 3. Сродак для існавання, заробак [2, с. 722].

Хлеб выступае ў прыказках як мера працы, маральны і нават сацыяльны крытэрый: *Калі паны лікуюць, тады мужыкі без хлеба*; *Не сеюць, не жнуць, а хлеб смачны ядуць* [3, с. 33]. Не ўсякі «хлеб» ацэньваўся людзьмі аднолькава. У прыказках называюцца групы людзей, заняткі якіх не цаніліся ў народзе, бо, магчыма,

яны былі не пастаянныя і не патрабавалі старання: *З музыкі хлеб невялікі*; *З музыкі хлеб невялікі, а з гулякі ніякі*;*У стральца і музыкі хлеб невялікі* [3, с. 81; 100].

Увага студэнтаў акцэнтуецца на тое, што хлеб у беларусаў бывае «зайцаў» і «сабачы». Так ацэньвалася колькасць і якасць хлеба: «Зайцаў хлеб (разм. жарт.) — рэшткі яды, прынесеныя з поля, з лесу дзецям» [3, с. 712], а сабачы — цяжкі, неспагадны, залежны. Аналіз зместу прыказак выяўляе, што сабачы хлеб у беларусаў ядуць тры катэгорыі людзей: *Асначы хлеб, служачы* (у значэнні ‘служыць’, ‘парабкаваць’) *хлеб, прымачы хлеб — сабачы* [3, с. 3; 27; 38; 130]. Змест прыказак дазваляе весці размову аб культуры харчавання, народных традыцыях, звязаных з хлебам.

Для правядзення рэфлексіі па вывучаным матэрыяле выкарыстоўваецца прыём «К’юбінг», які выявіць ступень сфарміраванасці даследчых уменняў і навыкаў студэнтаў у кантэксце іх этнакультурнай кампетэнцыі. Для рэалізацыі гэтага прыёму выкарыстоўваецца кубік, на кожным баку якога ўказана заданне-пытанне па вывучаемай тэме, напрыклад:

1. З якім значэннем ужываецца слова ‘хлеб’ у прыказках?
2. У якасці якіх крытэрыяў выступае хлеб у прыказках?
3. Растлумачце выраз: хлеб у беларусаў бывае «зайцаў» і «сабачы».

Адным з эфектыўных спосабаў выкарыстання графічнага метаду з’яўляецца кластар — «выдзяленне сэнсавых адзінак тэксту і іх графічнае афармленне ў пэўным парадку ў выглядзе гронкі або раўнамернае раскідванне да кожнай тэмы» [4, с. 56]. Такі падыход да арганізацыі вучэбнай дзейнасці дапамагае засвоіць большы аб’ём інфармацыі, чым студэнты маглі б атрымаць пры правядзенні звычайнай самастойнай пісьмовай работы. Так, пры вывучэнні семантычных груп назоўніка можа быць складзены кластар, у якім будзе звернута ўвага на этнакультуразнаўчую лексіку (рысунак 1).

Будуючы гронкі кластара, студэнты набываюць уменні прагназаваць, абагульняць, вучацца праводзіць аналогіі, устанаўліваць сувязі. Напрыклад, гронку з назвай «Моўны зварот» можна прадоўжыць наступнымі словамі: *сястрыца, дзедка, братка, браток, паненка* і г. д., што дазволіць павысіць маўленчую культуру студэнтаў.




Рысунак 1 — Кластар па тэме «Этнакультуразнаўчая лексіка»

Т а б л і ц а 1 — Дзённік падвоенага запісу

| **Цытата** | **Каментарый** |
|---|---|
| 1. Мова — своеасаблівая форма сацыяльнай памяці народа, яго духоўны скарб. Яна духоўна яднае народ, кансалідуе яго ў нацыю | 1. Мова з’яўляецца адной з абавязковых адзнак нацыі |
| 2. Старабеларуская мова ўжывалася ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, на ёй была створана багатая літаратура, навуковая і мастацкая, вялася дыпламатычная перапіска з іншымі дзяржавамі... | 2. На старабеларускай мове былі напісаны такія дакументы, як «Літоўская метрыка», «Статут ВКЛ» |

Мова — аснова нацыянальнай культуры, таму спасціжэнне яе законаў і таямніц з'яўляецца самым эфектыўным спосабам авалодання моваю як часткаю этнакультуры народа.

М. С. Булгакаў пісаў: «Нацыянальнасць праяўляецца ў культурнай творчасці. Самае магутнае дрэва культуры, у якім адбіваецца душа, нацыянальнасць, ёсць мова…» [5, с. 18]. Заняткі, прысвечаныя пытанню паходжання, станаўлення і развіцця мовы, накіроўваюць студэнтаў на пошук, роздум аб важнасці роднай мовы, прымушаюць іх задумацца і выказаць уласныя меркаванні пра ролю мовы ў грамадстве. Гэтаму будзе садзейнічаць прыём «Дзённік падвоенага запісу». Сутнасць вучэбнай дзейнасці ў тым, што ў левы слупок табліцы падаецца інфармацыя, а ў правы — каментарый да яе, які можа ўяўляць сабой: пазіцыю чытача (за/супраць); інтэрпрэтацыю выпісанай цытаты; пытанні адносна прачытанага і г. д.

Заняткі па тэме «Беларуская мова — нацыянальная мова беларускага народа, яе паходжанне і развіццё» завяршаюцца складаннем табліцы (табліца 1).

Эфектыўным прыёмам, які адлюстроўвае творчую дзейнасць студэнтаў на занятках, з'яўляецца «Хоку», які мае ўстойлівую будову — у кожным радку вызначаная колькасць складоў: пяць у першым, сем у другім, пяць у трэцім, усяго сямнаццаць складоў. Галоўнае пры выкарыстанні дадзенага прыёму — выразіць асноўную ідэю вучэбных заняткаў:

1. Фар – мі – ра – ва –нне.
2. Эт – на – куль – ту – ра – знаў – чай.
3. Кам – пе – тэн – цы – і.

Названыя метадычныя падыходы даюць магчымасць звязаць у адно цэлае розныя аспекты выкладання мовы, рэалізаваць этнакультуразнаўчы патэнцыял і прынцып узаемасувязі культур, што ў цэлым садзейнічае фарміраванню этнакультурнай кампетэнцыі будучых настаўнікаў.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Новые ценности образования : Тезаурус для учителей и школьных психологов. Вып. 1 / ред.-сост. Н. Б. Крылова. — М. : [б. и.], 1995. — С. 55.
2. Тлумачальнік слоўнік беларускай мовы / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. — 2-е выд. — Мн. : БелЭн, 1999. — 784 с.
3. Беларускі фальклор: хрэстаматыя : вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ / склад. К. П. Кабашнікаў [і інш.]. — 4-е выд., перапрац. — Мн. : [б. в.], 1996. — 856 с.
4. *Загашев, И. О.* Учим детей мыслить критически / И. О. Загашев, С. И. Заир-Бек, И. В. Муштавинская. — СПб. : Альянс Дельта, 2003. — 192 с.
5. *Булахова, З. Н.* Применение технологии развития критического мышления на уроках русского языка и литературы / З. Н. Булахова // Нар. асвета. — 2004. — № 9. — С. 15—19.

Материал поступил в редакцию 25.10.2013 г.

**УДК 373.6**

***Ж. А. Головко***
Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи

# РАЗНООБРАЗИЕ ФОРМ РЕЧЕВОЙ ИНТЕРПРЕТАЦИИ ПРИ ИЗУЧЕНИИ ЛИТЕРАТУРНО-БИОГРАФИЧЕСКОГО МАТЕРИАЛА НА ПРЕДМЕТАХ ГУМАНИТАРНОГО ПРОФИЛЯ

Уникальность творческого подхода учителя к преподаванию литературы заключается в том, что на уроке органически переплетены разные виды творчества вообще. По отношению к художественному тексту, какими бы новейшими рекомендациями ни был вооружен педагог, учитель выступает прежде всего как литературовед-исследователь, биограф-исследователь.

Понятие эстетического блока в деятельности учителя литературы подразумевает решение совокупности художественно-педагогических, методических, нравственно-эстетических задач. Сфера применения литературоведческих знаний самая широкая — каждодневная жизнь. Но в чистом виде это знание не всегда «работает» даже у больших мастеров урока. Нужны «мостики», «увязки», новые подходы в обучении ещё на этапе подготовки будущего специалиста [1, с. 72].

На производственной практике при подготовке и проведении урока студент-практикант становится сценаристом, режиссером, исполнителем, опытным литературоведом, психологом, историком, географом. Вот почему необходимы специальные задания, упражнения, развивающие творческие художественно-исследовательские умения у студентов. Специальных занятий на изучение биографического жанра в учебных программах по методике преподавания русской литературы и риторике не отводится. На взгляд автора, познакомить будущих учителей литературы с разными интересными формами изложения биографии писателя школьникам является важной методической задачей. Вовлекать студенческую аудиторию в литературно-методическую деятельность по знакомству с биографическим жанром необходимо на учебных занятиях по методикам, истории литературы, риторике [2, с. 134; 1, с. 75].